**МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС «КУРГАН СЛАВЫ»**
**(СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, 22-І КМ ШАШЫ МІНСК – МАСКВА)**



**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле [дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь]):** 613Д000591

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, 22-і км шашы Мінск – Масква

**Каардынаты:** 54.019052, 27.898148

**Кароткае апісанне:**

Мемарыяльны комплекс «Курган Славы» – помнік гісторыі, складанае інжынерна-архітэктурнае збудаванне, якое мае форму кургана. Усталяваны ў гонар подзвігу войнаў 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтійскага франтоў у Беларускай аперацыі 1944 г.

**Апісанне:**

Мемарыяльны комплекс «Курган Славы» – помнік гісторыі (шыфр **613Д000591**), складанае інжынерна-архітэктурнае збудаванне, якое мае форму кургана (вышыня 35 м.). Урачыстае адкрыццё мемарыяльнага комплексу “Курган Славы” адбылося ў 25-ю гадавіну вызвалення Беларусі – 5 ліпеня 1969 года.

Курган Славы – найскладанае інжынернае збудаванне. Яго аўтары – скульптары А. Арцімовіч і А. Бембель, архітэктары Л. Міцкевіч і А. Стаховіч, інжынер В. Лапцэвіч – стварылі ўнікальны праект па тыпу старажытнай разнавіднасці пахавальных помнікаў.

Першую жменю зямлі ў падножжа Кургана лягла 30 верасня 1966 года. З гэтага дня зямлю працягвалі везці на месца мемарыяльнага комплексу з беларускіх гарадоў і вёсак, гарадоў-герояў Масквы, Ленінграда, Валгаграда, Севастопаля, Адэсы, Кіева, легендарнай Брэсцкай крэпасці-героя і іншых памятных месцаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Закладка Кургана суправаджалася тэкстам наказу нашчадкам, які ў спецыяльнай капсуле замураваны ў падставе ўзгорка.

Агульная вышыня мемарыяла складае 70 метраў 60 сантыметраў. Земляны пагорак дасягае вышыні 35 метраў. На вяршыні кургана – чатыры штыкі, якія сімвалізуюць чатыры фронты, якія вызвалялі Беларусь летам 1944 года ад немцаў. Вялізныя штыкі на вяршыні ўзятыя ў шырокае кольца. На яго ўнутраным боку надпіс: “Арміі Савецкай, Арміі-вызваліцельніцы – Слава!”. З вонкавага – сем барэльефаў-сімвалаў абаронцаў Радзімы: стары-партызан, юная партызанка, матрос, пілот, стары і малады пяхотнікі, танкіст. Тут жа мазаікай выкладзеныя Ордэны Славы і Вялікай Айчыннай вайны. Ад падножжа кургана, апяразваючы яго, да манумента вядуць дзве бетонныя лесвіцы, кожная з якіх мае 241 прыступку. Ля падножжа Кургана ўстаноўлены мемарыяльныя гранітныя пліты з інфармацыйным тэкстам.

Таксама, на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу размяшчаюцца: пляцоўка ваеннай тэхнікі; «Алея герояў Міншчыны»; экспазіцыя пад адкрытым небам «Пераможнае лета»; тэхнічны басейн.

**Гістарычная даведка**. Нямецка-фашысцкія акупанты стварылі на тэрыторыі Беларусі глыбока эшаланіраваную (да 270 км) сістэму абароны. Мінск, Віцебск і іншыя гарады былі аб’яўлены крэпасцямі. Гітлераўцы сканцэнтравалі ў Беларусі 63 дывізіі і 3 брыгады, у складзе якіх налічвалася 1,2 млн. чалавек. Тут было размешчана каля 10 тыс. гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, каля 1350 самалётаў і шмат іншай ваеннай тэхнікі.

Войскі 1-га Прыбалтыйскга (генерал арміі І. Х. Баграмян), 3-га Беларускага (генерал-палкоўнік, з 26.06.1944 г. генерал арміі І.Д.Чарняхоўскі), 2-га Беларускага (генерал-палкоўнік, з 28 чэрвеня 1944 г. генерал арміі Г.Ф.Захараў) франтоў 23.06.1944 г. пасля моцнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўцы пачалі наступленне на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках.

24 чэрвеня ў наступленне перайшлі войскі 1-га Беларускага фронту (генерал арміі, з 29.06.1944 г., Маршал Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскі) на Бабруйскім напрамку. Войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў, зламаўшы ўпартае супраціўленне ворага, разграмілі віцебскую групоўку гітлераўцаў і 26 чэрвеня вызвалілі Віцебск. Сілы 3-га Беларускага фронту да 1 ліпеня 1944 г. ліквідавалі аршанскі і барысаўскі вузлы абароны праціўніка. Войскі 2-га Беларускага фронту на Магілёўскім напрамку фарсіравалі рэкі Проня, Бася, Дняпро і 28 чэрвеня авалодалі Магілевам. Часці 1-га Беларускага фронту да 29 чэрвеня разбілі бабруйскую групоўку войск праціўніка і вызвалілі Бабруйск. 3 ліпеня вызвалены Мінск. На ўсход ад горада савецкія войскі акружылі 105-тысячную групоўку ворага і да 11 ліпеня ліквідавалі яе. Стварыліся спрыяльныя ўмовы для дальнейшага наступлення Чырвонай Арміі. Да канца ліпеня 1944 г. тэрыторыя Беларусі была поўнасцю вызвалена ад акупантаў. Увыніку пасяховага ажыццяўлення Беларускай аперацыі (закончана 29.08.1944 г.), апрача Беларусі, вызвалена таксама большая частка Літвы, частка Латвіі і значная частка Польшы. Была разгромлена нямецка-фашысцкая група «Цэнтр», поўнасцю знішчаны 17 дывізій, 3 брыгады, 50 дывізій праціўніка страцілі больш паловы свайго складу.

У ажыццяўленні Беларускай аперацыі Чырвонай Арміі дапамагалі партызаны, падпольшчыкі, насельніцтва Беларусі. Тут на пачатак лета 1944 г. дзейнічалі 144 партызанскія брыгады і 80 асобных атрадаў. За тры дні да пачатку аперацыі яны пачалі масавае разбурэнне чыгуначных камунікацый ворага метадам «рэйкавай вайны». У выніку нанесеных udараў аказаліся поўнасцю разбуранымі найважнейшыя чыгуначныя лініі. Праціўнік не змог іх

выкарыстаць для падвозу рэзерваў, эвакуацітылоў і вывазу нарабаванай маёмасці. Партызаны і ўдзельнікі падполля вялі разведку, перадвалі камандаванню Чырвонай Арміі важныя звесткі аб ворагу, захоплівалі масты і пераправы, пераразалі шляхі адступлення праціўніка, зрывалі яго арганізаваны адыход, знішчалі жывую сілу і тэхніку, вызвалілі ад захопнікаў некаторыя населеныя пункты, ратавалі насельніцтва ад знішчэння і вывазу на катаргу ў фашысцкую Германію. Беларускія партызаны дапамагалі Чырвонай Арміі ліквідаваць акружаныя групоўкі праціўніка. Яны знішчылі больш за 15 тыс. і ўзялі ў палон больш як 17 тыс. гітлераўцаў.

У час вызвалення Беларусі праявіўся масавы гераізм воінаў і партызан. Больш як 1500 воінаў удастоены звання Героя Савецкага Саюза, больш за 402. тыс. воінаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Больш як 600 злучэнням і часцям Чырвонай Арміі, што асабліва вызначыліся ў час Беларускай аперацыі, прысвоены ганаровыя найменні «Віцебскіх», «Магілёўскіх», «Мінскіх», «Неманскіх», «Брэсцкіх» і інш.

Мемарыяльны комплекс “Курган Славы” створаны ў гонар завяршэння аперацыі па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У аперацыі пад кодавай назвай “Баграціён” прымалі ўдзел чатыры фронты: 1-й Беларускі, 2-й Беларускі, 3-й Беларускі і 1-й Прыбалтыйскі, пад камандаваннем славутых палкаводцаў К. К. Ракасоўскага, Г. Ф. Захарава, І. Д. Чарняхоўскага, і І. Х. Баграмяна, а таксама маракі Дняпроўскай рачной флатыліі і эскадрылля французскіх лётчыкаў-добраахвотнікаў “Нармандыя”. Неацэнную дапамогу арміі аказалі беларускія партызаны.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

2. Дзяржаўная ўстанова «Дзяржаўны мемарыяльны комплекс Хатынь» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://khatyn.by/ru/filialy/kurgan-slavy. – Дата доступа: 15.10.2022.

3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

4. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.